*Ірына Мілінкевіч*

# Да пытання атрыбуцыі драўлянага медальёна са шкаплера Мікалая Крыштафа Радзівіла (1695–1715)

Летам 2017 г. былі праведзены даследаванні ў крыпце нясвіжскага касцёла. Працы праходзілі ў рамках літоўска-беларускага праекта «Даследаванні і канцэпцыя прыстасавання да наведвання крыпты княжацкага роду Радзівілаў у крыпце нясвіжскага касцёла» **(іл. 1)**.

Былі адкрыты і даследаваны шэсць пахаванняў. Галоўнай мэтай прац з’яўлялася ідэнтыфікацыя астанкаў, фіксацыя і аналіз, выяўленне стану, а таксама даследаванне магчымасці захавання і рэстаўрацыі прадметаў, якія былі ў саркафагах [4, с. 239].

У саркафагу № 14 знаходзіліся астанкі Мікалая Крыштафа Радзівіла (1695–1715), старшага сына Караля Станіслава і Ганны Сангушкі Радзівіл **(іл. 2)**. Звестак пра яго мала, вядома, што ён памёр у маладым узросце (20 гадоў) і не

паспеў праявіць сябе ні ў палітычным, ні ў эканамічным напрамку [4, с. 245]. У дзяцінстве і юнацтве, якія выпалі на час Паўночнай вайны, Мікалаю Крыштафу давялося шмат ездзіць з бацькамі ў пошуках прытулку ад шведаў. Хваравіты з маленства, ён памёр 2 чэрвеня 1715 г. ад "zmaligny i petocyji" («гарачкі і петэхій»)[1] [11, с. 13].

Яго заўчасная смерць была вялікай трагедыяй для сям'і – старэйшага сына традыцыйна рыхтавалі да ролі ардыната, главы роду і ўладальніка вялізных латыфундый. Менавіта пасля яго смерці ў сваім дзённіку Караль Станіслаў напісаў: *«Fatalis у доме маім, калі ў самую поўнач забраў у нас Найвышэйшы Пан да хвалы сваёй святой старэйшага Мікалая Падстольніка Літоўскага».* Звыкла сціплы ў сваіх выказваннях, у дзённіку Караль Станіслаў быў вельмі эмацыянальны [5, с. 22].

У металічным саркафагу Мікалая Крыштафа Радзівіла знайшлі ў доўгай ільняной кашулі, паверх яе было апранута адзенне з шаўковай тканіны з раслінным узорам **(іл. 3)**. З гэтай жа тканіны сшыты і галаўны ўбор нябожчыка. Таксама выяўлены фрагменты пальчаткі і туфлі з жоўтага шоўку і шаўковая падушачка, пакладзеная пад галаву, набітая галінкамі туі [4, с. 246].

На Мікалаі Крыштафе Радзівіле быў надзеты шкаплер[2]. З шасці даследаваных пахаванняў шкаплеры былі яшчэ

[1]Петэхіі – гэта падскурныя высыпанні. Могуць быць прыкметай трамбацытапеніі (зніжэнне колькасці трамбацытаў) пры затрымцы аднаўлення трамбацытаў (як пабочны эфект лекаў або з прычыны некаторых інфекцыйных захворванняў) або пры парушэнні згусальнасці крыві.

[2]Шкаплер – гэта спецыяльны прадмет, які носяць католікі, прымаючы пэўныя абавязацельствы і атрымліваючы пэўныя прывілеі. (Хто носіць шкаплер, мае апеку Панны Марыі над душой і целам у жыцці і асабліва ў хвіліну смерці. Хто носіць шкаплер і захоўвае чысціню паводле стану, будзе выбаўлены з чыстца ў першую суботу пасля сваёй смерці.)

на двух прадстаўніках роду (Францішцы Уршулі і Карале Станіславе Пане Каханку).

Шкаплер М. К. Радзівіла складаецца з двух злучаных муаравымі стужкамі прамавугольных мяшочкаў тканіны. Знешні бок зроблены з шарсцяной тканіны. У цэнтры кожнага прамавугольніка металічнымі ніткамі вышыты два пераплеценыя сэрцы, унутры якіх на адным вышыта лацінская абрэвіятура Хрыста, а на другім – манаграма Панны Марыі. Дзве часткі шкаплера абрамленыя лацінскімі выразамі: *VERBUM CARO FACTUM EST* (…Слова стала целам… (Ін. 1:14)) і *MATER DEI MEMENTO MEI* (Маці Божая, памятай мяне) [6] **(іл. 4)**.

Цікавасць выклікаюць прадметы, якія былі знойдзены ўнутры мяшочкаў. У той частцы шкаплера, дзе вышыта манаграма Дзевы Марыі, знайшлі кавалак дрэва. Відавочна, гэта сакральная рэліквія. Дакладна адказаць на пытанне, што гэта за дрэва і адкуль яно, пакуль немагчыма. Няменшую цікавасць выклікае другая частка шкаплера. Літоўскія даследчыкі ў рэстаўрацыйным пашпарце адзначылі: *«У частцы шкаплера з абрэвіятурай Хрыста быў зашыты драўляны авальны медальён (2,5х2 см), на адным баку якога выгравіравана выява Дзевы Марыі з немаўлём, а на другім – абрэвіятура Хрыста* **(іл. 5)**.

Пасля разбору гэтага мяшочка для прамыўкі была знойдзена трэцяя рэліквія – мяшочак з шаўковай тканіны, а ў ім – камякі смалы, загорнутыя ў паперу» [6].

На паперы, у якую была загорнута смала, быў выяўлены фрагмент цяжкачытэльнага рукапіснага тэксту. На жаль, адзінае, што можна пра яго сказаць, – гэта тое, што літары

лацінскія **(іл. 6)**. Літоўскімі рэстаўратарамі ўстаноўлена, што гэта смала – ладан[1]. З гэтага вынікае, што мяшочак са смалой – гэта ладанка. Слоўнік У. І. Даля кажа, што *«шаўковы мяшочак з ладанам і запісанай малітвай насілі на грудзях і прыпісвалі яму магічную сілу супраць злых духаў»* [10].

Выклікае пытанне атрыбуцыя трэцяй рэліквіі са шкаплера М. К. Радзівіла – *«драўлянага авальнага медальёна з выявай Дзевы Марыі з немаўлём»*.

Першае, што звяртае на сябе ўвагу, – гэта якасная мастацкая праца, якая больш чым за тры стагоддзі не страціла сваёй прыгажосці. Выразна прарэзаныя дзве фігуры, на галовах якіх відаць трохвугольныя шапкі, вельмі падобныя на традыцыйны галаўны ўбор рымска-каталіцкага духавенства – берэт. Як правіла, такія ўборы адрозніваюцца колерам і колькасцю пялёсткаў у залежнасці ад месца чалавека ў касцёльнай іерархіі. На жаль, драўляны медальён не дае магчымасці гэта вызначыць. Што тычыцца адзення, то і яно больш падобнае на святарскія рызы, чым на вопратку Божай Маці з немаўлём.

Каб вызначыць, што гэта за выявы, трэба звярнуцца да рэлігійных традыцый сям'і Радзівілаў і гісторыі з'яўлення і выкарыстання шкаплера.

Гісторыя шкаплера пачынаецца на гары Кармель у Палесціне. Тут з'яўляецца новы манаскі ордэн Найсвяцейшай Панны Марыі (кармеліты). У сярэдзіне XIII ст. на еўрапейскіх землях прадстаўнікі гэтага ордэна перажывалі крызіс, выйсцю з якога дапамагло з'яўленне Маці Божай з

[1]Ладан – араматычная смала, якую атрымліваюць пры падсечцы кары дрэва басвелія.

падарункам – шкаплерам генералу закону Сымону Штоку. Насіць яго дазвалялася не толькі прадстаўнікам ордэна, але і свецкім асобам, якія выконвалі шэраг умоў. Галоўны сэнс нашэння шкаплера можна выказаць адной фразай: *«Хто памрэ, носячы шкаплер, не будзе гарэць у вечным агні»*. Трэба адзначыць, што пекла ва ўяўленні тагачаснага чалавека было надзвычайна страшным[1] [9]. Не здзіўляе, што веруючыя людзі шукалі спосабы аблегчыць сваё жыццё на тым свеце.

Пры наступным крызісе, які адбыўся праз тры стагоддзі, кармеліты падзяліліся на «босых» і «абутых».[2] Дзейнасць кармелітаў босых на тэрыторыі Рэчы Паспалітай пачалася ў 1605 г. У хуткім часе іх кляштары паўсталі ва многіх гарадах ВКЛ (Вільні, Гродне, Мядзеле, Пінску і інш.) [8, с. 151]. Галоўнай мэтай ордэна была місіянерская дзейнасць, а таксама пашырэнне культу Панны Марыі і яе міласцей. У гонар Багародзіцы асвячаліся касцёлы, кляштары, з'яўляліся шматлікія абразы з марыйнымі сюжэтамі.

Нясвіжская лінія Радзівілаў адрознівалася сваёй рэлігійнасцю і адданасцю каталіцкаму касцёлу. Яе прадстаўнікі не толькі былі фундатарамі многіх касцёлаў і кляштараў у сваіх маёнт-

---

[1]У аснову каталіцкіх апісанняў пекла пакладзены бачанні Святога Паўла, які атрымаў магчымасць наведаць царства Сатаны. Блукаючы па гэтым страшным месцы, апостал бачыў жудасныя рэчы: вогненнае дрэва, на якім віселі грэшнікі, гарачыя печы і глыбокія калодзежы [9].

[2]У XVI ст. рэфарматарка Тэрэза Авільская абвінаваціла кіраўніцтва ў адыходзе ад галоўных прынцыпаў кармелітаў і прапанавала новы статут, які адрозніваўся ад старога ўзмацненнем зарокаў і больш аскетычным ладам жыцця, што замацавалася ў назве – «кармеліты босыя». У 1593 г. адбылося афіцыйнае зацвярджэнне статута «кармелітаў босых» і іх адасабленне ад асноўнай часткі ордэна. А народ, каб адрозніваць кармелітаў паміж сабой, у процівагу «кармелітам босым» пачаў называць прыхільнікаў старога, больш лаяльнага статута «кармелітамі абутымі».

ках, але і выступалі як спонсары многіх рэлігійных мерапрыемстваў. Напрыклад, княгіня Ганна Сангушка, маці М. К. Радзівіла, пры падрыхтоўцы да каранацыі абраза Жыровіцкай Маці Божай ахвяравала абразу кляйноты «каралеўскай вартасці» [2, с. 51]. Тым больш што дабрачыннасць у той час успрымалася як адзін са шляхоў выратавання душы.

Каб падкрэсліць свой уклад у «богаўгодныя справы» (ахвяраванні, дабрадзейнасць і інш.), складваецца традыцыя напісання абразоў з выявамі данатараў. Так, у касцёле Перамянення Божага ў вёсцы Новая Мыш (частку ўбрання гэтага касцёла перавезлі сюды з нясвіжскага кляштара бенедыкцінак) знаходзіцца абраз «Божая Маці Шкаплерная», напісаны ў 1719 г. На гэтым абразе змешчаны сюжэт атрымання шкаплераў мужчынамі і жанчынамі (свецкімі асобамі). Адносна нядаўна высветлілася, што гэта выява сям'і канцлера вялікага літоўскага Караля Станіслава Радзівіла (1669–1729). Відавочна, што абраз быў напісаны пасля важнай падзеі ў сям'і магната (напрыклад, атрымання шкаплераў і дадзеных зарокаў).

На абразе акрамя Дзевы Марыі і Бога-айца можна ўбачыць шэсць чалавек: Караля Станіслава Радзівіла з жонкай Ганнай Кацярынай з Сангушак, іх дзвюх дачок і двух сыноў. Як сцвярджае В. Папко ў сваім артыкуле, адзін з маладых людзей – гэта (ужо на той час памерлы) Мікалай Крыштаф Радзівіл **(іл. 7)**.

Цікавым з'яўляецца тое, што на абразе намаляваны толькі старэйшыя дзеці, якія, хутчэй за ўсё, ужо прынеслі зарок Дзеве Марыі і атрымалі шкаплеры. Пры даследаванні пахаванняў Радзівілаў шкаплераў не аказалася на трох з шасці

нябожчыкаў, сярод якіх і Міхаіл Казімір Радзівіл Рыбанька, які прысутнічае на абразе ў касцёле Перамянення Божага ў Новай Мышы. Улічваючы адносіны сям'і Радзівілаў да сакрамантаў і рэлігійных абрадаў, адсутнасць шкаплера наводзіць на думку, што саркафагі раней ужо адкрывалі і ёсць вялікая верагоднасць, што яны былі адтуль выняты і знаходзяцца ў прыватных калекцыях.

Вяртаючыся да атрыбуцыі драўлянага медальёна Мікалая Крыштафа Радзівіла, хацелася б заўважыць, што медальён ляжаў у частцы шкаплера з манаграмай Ісуса Хрыста (IHS). Хоць гэта абрэвіятура і вядома з першых стагоддзяў хрысціянства, са з'яўленнем езуітаў яна становіцца эмблемай ордэна. Такія ж літары ёсць і на самім медальёне (з вонкавага боку), што наводзіць на думку пра сувязь паміж ордэнам і медальёнам. Папулярнасць езуітаў у канцы XVI – XVII ст. была вельмі вялікай. Дзякуючы каралеўскім і магнацкім фундацыям паўставалі новыя храмы і калегіумы. Толькі за XVII ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі было пабудавана 15 кляштараў і касцёлаў [3]. Замацаванню і пашырэнню ордэна езуітаў на беларускіх землях спрыяла не толькі эканамічная база, але і ідэалагічны складнік. Праца езуіцкіх ідэолагаў, такіх як Пётр Скарга, Станіслаў Лянчыцкі, Францыск Суньер і інш., была накіравана на ўмацаванне каталіцызму сярод кіруючай эліты [3].

Радзівілы пачынаючы з XVI ст. цесна кантактавалі з прадстаўнікамі гэтага ордэна. Улічваючы гэтыя факты, а таксама манаскае адзенне і галаўны ўбор (берэт), можна выказаць здагадку, што дамінуючай фігурай на медальёне з'яўляецца Ігнацій Лаёла – заснавальнік і першы генерал


Гравюра П. П. Рубенса.
Жыццё Святога Ігнацiя Лаёлы

Таварыства Хрыста. Што тычыцца невялікай фігуры з левага боку, то, верагодна, яна алегарычная і прадстаўляе ўвесь манаскі ордэн езуітаў, апекуном якога з'яўляўся заснавальнік ордэна Ігнацій Лаёла. Тым больш што пачынаючы з канца XVI ст. формы медальёнаў станавіліся больш разнастайнымі (авал – як у прадстаўленага медальёна), і на паверхнях рэльефаў павялічвалася колькасць алегарычных выяў [12, с. 2304].

Доказам вышэйсказанага з'яўляюцца ранейшыя выявы галоўнага езуіта. Першыя працы, прысвечаныя біяграфічным звесткам Ігнацыя Лаёлы, былі надрукаваны яшчэ ў канцы XVI ст. Калі пачаўся працэс яго беатыфікацыі, напісаныя да гэтага яго біяграфіі дапоўніліся ілюстрацыямі (гравюрамі), аўтарам многіх з якіх быў П. П. Рубенс [7]. На многіх гравюрах Ігнацій Лаёла паказаны ў берэце і з кнігай

у руцэ **(іл. 9)**. Дарэчы, кніга сімвалізуе не толькі вучэнне ордэна Таварыства Хрыста, але і Статут ордэна, які быў напісаны І. Лаёлам.

Відавочна, што дрэва, з якога зроблены медальён, прамочана спецыяльнымі сродкамі, дзякуючы чаму гэты матэрыял не сапсаваўся за тры стагоддзі і захаваўся ў добрым стане. Хоць драўляных аналагаў медальёна знайсці не атрымалася (праз праблему захоўвання), існуюць металічныя медальёны таго ж часу з выявай Ігнація Лаёлы [1] **(іл. 7)**. Пазнейшыя металічныя медальёны з выявай гэтага езуіта амаль паўтараюць выяву XVII ст. [13].

Падсумоўваючы вышэйпададзенае, хацелася б звярнуць увагу на тое, што мэтай многіх рэлігійных цырымоній і рытуалаў было дапамагчы нябожчыку пазбегнуць пакут і дасягнуць вечнага збавення. Стараннасць і нават скрупулёзнасць магнатаў Радзівілаў у поўнай меры адпавядае хрысціянскай эсхаталогіі. Шкаплер выконваў ахоўную ролю: *«Хто насіць яго будзе, той будзе вызвалены з чысцца ў першую суботу пасля сваёй смерці»*. Сакральныя прадметы ўнутры шкаплера павінны былі падтрымаць і забяспечыць гэту функцыю, таму не здзіўляе падбор прадметаў і сімвалаў на іх.

### Крыніцы і літаратура


1. Антиквариат и Коллекционирование. Медальон церковный. Игнатий Лойола, 1622 г. [Электронны рэсурс] Рэжым доступу: https://newauction.com.ua/offer/medalon_cerkovnyj_ignatij_lojola_1622_g_redkost-i6530221279.html#5 – Дата доступу: 05.08.2020.

2. Бараноўскі, А. Роля магнатаў у каранацыі абразоў Божай Маці ў Вялікім Княстве Літоўскім / А. Бараноўскі // Спадчына № 5–6 / рэд. А. Анціпенка, У. Арлоў і інш. / Мінск, 2002. – С. 47–55.
3. Блинова, Т. Б. Иезуиты в Белоруссии / Т. Б. Блинова / ред. А. А. Подзярей / Минск, 1990. – С. 109.
4. Блинец, А. В. Исследования Радзивилловской крипты в 2017 г. / А. В. Блинец // Acta Anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». Т. 4 / уклад. А. У. Блінец; рэдкал.: А. А. Гужалоўскі [і інш.] / Нясвіж, 2018. – С. 239 –252.
5. Папко, В. М. Абраз «Божая Маці Шкаплерная» з касцёла ў вёсцы Новая Мыш / В. М. Папко // Беларускі гістарычны часопіс. – 2017. – № 9. – С. 17–22.
6. Реставрационная документация. Скапулярий с реликвиями. Инд. № НД 007520/0001 – НД 007520/0002. Реставрационный центр им. П. Гудинаса 21.11.2018–20.11.2019.
7. Рубенс, П. Жизнь Святого Игнатия Лойолы. [Электронны рэсурс] Рэжым доступу: https://regnum.ru/pictures/2184382/71.html – Дата доступу: 10.08.2020.
8. Рэлігія і царква на Беларусі / Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. – С. 365.
9. Стахно, Н. В. Пекла ў каталіцкай і праваслаўнай царкоўных пропаведзях у Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XVI – XVIII ст. / Н. В. Стахно // Романовские чтения – 13: сб. ст. Междунар. науч. конф., посвящ. 105-летию МГУ им. А. А. Кулешова, Могилев, 25–26 октября 2018 г. / ред. А. С. Мельникова. – Могилев, 2019. – С. 25–26.
10. Толковый словарь Даля. [Электронны рэсурс] Рэжым доступу: https://www.slovardalja.net/word.php?wordid=14684. – Дата доступу: 12.09.2020.

11. Karkucińska, W. Anna z Sanguszków Radziwiłłowa: (1676–1746): działność gospodarczai mecenat / W. Karkucińska // Wydawnictwo Naukowe Sempen / Warszawa, 2000. – S. 13.
12. Więcek, A. Dziejesztuki medalierskiej w Polsce. / A. Więcek / Kraków, 1989. – C. 326.
13. Rewoliński, T. Katalog medali religijnych odnoszących się do kościoła katolickiego. 1887 г. [Электронны рэсурс] Рэжым доступу: https://polona.pl/item/medale-religijne-odnoszace-sie-do-kosciola-katolickiego-we-wszystkich-krajach-dawnej – Дата доступу:15.09.2020.

# Ілюстрацыі да артыкула І. Мілінкевіч



*Іл. 1. Даследаванні ў крыпце нясвіжскага касцёла ў 2017 г.*




*Іл. 2. Мікалай Крыштаф Радзівіл (1695–1715)*



*Іл. 3. Саркафаг № 14 з астанкамі М. К. Радзівіла*




*Іл. 4. Шкаплер М. К. Радзівіла (пасля рэстаўрацыі)*




*Іл. 5. Драўляны медальён з шкаплера М. К. Радзівіла*



*Іл. 6. Запіска з ладанкі М. К. Радзівіла*



*Іл. 7. Абраз «Божая Маці Шкаплерная» у касцёле Перамення Божага ў Новай Мышы*




*Іл. 8. Ігнацій Лаёла*



*Іл. 9. Металічны медальён з выявай Ігнацыя Лаёлы XVII ст.*